# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД

*Запрудскі І.І.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск
E-mail: Albarutenicageo@gmail.com

Праблематыка перыядызацыі індустрыяльнага развіцця БССР з’яўляецца актуальнай не толькі для гістарычнай, але і геаграфічнай навукі. Вылучэнне этапаў развіцця прамысловасці дазволіць прасачыць і структурыраваць тыя трансфармацыйныя тэндэнцыі, якія адбыліся ў яе тэрытарыяльна-галіновай структуры, вызначыць дамінуючыя умовы, прынцыпы і фактары размяшчэння вытворчасці. Толькі праз аналіз змен, якія адбываліся раней, можна зразумець прычыны і трэнды сучасных структурных зрухаў.

У даследаванні на падмурку эканоміка-геаграфічнага аналізу дынамікі і асаблівасцяў размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў былі вылучаны 4 хвалі індустрыялізацыі рэспублікі:

I. станаўлення і рэпатрыяцыі вытворчасці (1944 –1950);
II. узмоцненага развіцця машынабудавання (1951 –1960);
III. тэхналагічнай мадэрнізацыі і «хімізацыі» вытворчасці (1961 –1980);
IV. стагнацыі вытворчасці (1981 –1991).

У перыяд *першай* хвалі было адкрыта каля 55 новых прадпрыемстваў, таксама была адноўлена праца даваенных вытворчасцей – найбольшая ўвага надавалася галінам апрацоўчай прамысловасці, звязаным з баявымі дзеяннямі, а таксама прадметам першай неабходнасці: вытворчасць транспартных сродкаў і харчовых прадуктаў, вырабаў тэкстыльнай і швейнай вытворчасці. Галоўныя змены ў тэрытарыяльнай структуры прамысловасці Беларусі праяўляліся ў інтэграцыі прамысловых прадпрыемстваў заходняй Беларусі ў агульную з усходняй сістэму.

*Другая* хваля індустрыялізацыі ў Беларусі звязана з геапалітычнымі зменамі ў эканоміка-геаграфічным становішчы рэспублікі. У пасляваенны перыяд са з’яўленнем Савета эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ) і Арганізацыі Варшаўскай дамовы (АВД) становішча рэспублікі кардынальна змянілася: з буфернай небяспечнай зоны Беларусь ператварылася ў рэгіен СССР, які стаў займаць цэнтральнае становішча ва ўзаемадзеянні краін сацыялістычнага лагера. У Беларусі распачалося стварэнне магутнага машынабудаўнічага комплексу, што прывяло да змен у тэрытарыяльнай структуры прамысловасці. На працоўнай і вытворчай базе Мінска пачынаеццафарміраванненовай формы тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі – прамысловага вузла. Вывучэннем Мінскага прамысловага вузла яшчэ за савецкім часам займалася Л.А. Паўловіч [1].

Новы этап развіцця прамысловасці ў Беларусі пачынаецца ў 1960-я гады. Прынятая савецкім урадам праграма хімізацыі і наступствы «зяленай рэвалюцыі» у народнай гаспадарцыпрадугледжвалі размяшчэнне ў рэспубліцы шэрагу буйных вытворчасцей мінеральных угнаенняў, хімічных нітак і перапрацоўкі нафты. Да 1980-га года ў БССР было адкрыта каля 250 прадпрыемстваў. У тэрытарыяльнай структуры прамысловасці назіраліся тэндэнцыі да звышканцэнтрацыі з фарміраваннем новых прамысловых вузлоў з хіміка-тэхналагічнай спецыялізацыяй.

Апошні этап характарызуецца агульным падзеннем дынамікі адкрыцця новых вытворчасцей і стабілізацыяй тэрытарыяльнай структуры прамысловасці. Дадзеныя тэндэнцыі звязаны з агульным крызісам у эканоміцы СССР, зменай тэхналагічнага ўклада ў вытворчасці і тагачаснай палітыкай савецкага ўрада. За перыяд XX стагоддзя Беларусь прайшла доўгі шлях ад аграрнай да індустрыяльнай краіны з буйным машынабудаўнічым і хімічным комплексам, што істотна змяніла эканамічны ландшафт краіны.

**Библиографические ссылки**

1. Павлович Л. А. Минский промышленный узел и перспективы его развития: дис. ... канд. геогр. наук: 11.694. Минск, 1970. 221 с.